№ 20 (889)
Май 2022 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года kazeta.by bfk.by



Язэп Пушча ў 1923 г. (з фондаў БДАМЛіМ)

*Не заблудзіўся я у цёмным лесе*
*І шлях да сонца адшукаў даўно.*
*Радзіму не пакіну я без песень,*
*Спяваю ёй і толькі ёй адной.*

*Дажджы чало і твар твой арасілі,*
*Авеялі легендамі бары.*
*Пакуль не падкасіла старасць сілы,*
*Табе я песню аддаю ў дары.*

*Пакуль душа і сэрца не азяблі*
*І не падкраўся загадзя мароз,*
*Прыйду я да тваіх асенніх яблынь,*
*Каб іх суровы сівер не атрос.*

*Язэп ПУШЧА*

# Асоба і спадчына Язэпа Пушчы: сучаснае прачытанне

***Круглы стол пад такой назвай, прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка, сябра літаратурнага аб'яднання «Маладняк» Язэпа Пушчы, адбыўся 20 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.***

Мерапрыемства было арганізавана ў рамках праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» і працягнула серыю ініцыятыў, якія ўжо чацвёрты год рэалізуюцца бібліятэкай у гонар юбілеяў беларускіх пісьменнікаў. У круглым стале прынялі ўдзел даследчыкі творчасці Язэпа Пушчы, спецыялісты з архіваў, музеяў, бібліятэк і ўстаноў адукацыі.

Адкрыў пасяджэнне намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктар Пшыбытка, які нагадаў пра пісьменнікаў – юбіляраў 2022 года і ініцыятывы, арганізаваныя бібліятэкай у іх гонар.

Мадэратарам круглага стала выступіла загадчыца сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве інфармацыйна-аналітычнага аддзела НББ, куратар праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» Таццяна Лаўрык.

Пад час адкрыцця круглага стала артысты народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» пад кіраўніцтвам Алесі Сівохінай «ажывілі» вершы Язэпа Пушчы і яго вядомы твор «Лісты да сабакі».

Пра віртуальную выставу да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Пушчы (1902 – 1964) і яе найбольш каштоўныя старонкі расказала галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела НББ Юлія Амосава.

У сваім грунтоўным выступленні кандыдат філалагічных навук, дактарант Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Ірына Багдановіч прадставіла Язэпа Пушчу як паэта-авангардыста, прыхільніка імажыністкіх традыцый і творчасці С. Ясеніна. Цікавыя прыклады з ранніх вершаў 1920-х гг., эмацыйнае чытанне, слушныя заўвагі зрабілі яе выступленне яскравым і запамінальным.

Паэму «Сады вятроў» (1930) прааналізавала кандыдат філалагічных навук, выкладчыца Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка Наталля Заяц.

Літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктар Жыбуль падрабязна пазнаёміў слухачоў з фондам № 26, у якім захоўваюцца дакументы Язэпа Пушчы, і матэрыяламі пра яго, якія перадаў сам пісьменнік, а пасля – яго ўдава Станіслава Шпакоўская.

Пра гады працы Язэпа Пушчы настаўнікам рускай мовы ў Манакоўскай і Чаадаеўскай сярэдніх школах, яго педагагічны талент распавёў вядучы бібліятэкар аддзела абслугоўвання спецыялізаванымі фондамі НББ Дзмітрый Давідоўскі.

Далей быў прадстаўлены відэафрагмент экскурсіі па творчасці Язэпа Пушчы ў школьным музеі «Жыва народная памяць» Чаадаеўскай сярэдняй адукацыйнай школы Мурамскага раёна Уладзімірскай вобласці (Расія). У музеі гэтай школы ёсць літаратурна-краязнаўчая зала (кіраўнік Наталля Пахомава), у якой захоўваецца памяць пра Язэпа Пушчу.

Доўгаму вяртанню Язэпа Пушчы да творчасці, да сябе, свайго паэтычнага псеўданіма было прысвечана выступленне загадчыка Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіла Бараноўскага.

Пад час працы над раздзелам да юбілею Язэпа Пушчы бібліятэка наладзіла стасункі з Навадворскай сярэдняй школай Мінскага раёна, вучні і настаўнікі якой цікавяцца ініцыятывамі праекта і ўдзельнічаюць у літаратурных конкурсах НББ. На круглы стол была запрошана вучаніца 9 класа Паліна Сташэўская. Яна расказала пра ініцыятывы, што ладзіць школа ў гонар свайго земляка.

Напрыканцы круглага стала быў прадстаўлены відэафрагмент сустрэчы з дачкой Язэпа Пушчы Лідзіяй Іосіфаўнай, які запісалі ў 2008 годзе вучні і настаўнікі Навадворскай сярэдняй школы на чале з намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце Таццянай Васілевіч.

Пасля заканчэння пасяджэння ўдзельнікі круглага стала пазнаёміліся з кніжнай выставай «Вольны птах беларускіх нябёсаў», прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, што працуе ў зале беларускай літаратуры да 29 чэрвеня. Пра яе распавёў куратар выставы Дзмітрый Давідоўскі.

Сустрэча атрымалася вельмі душэўнай, сяброўскай. Спадзяемся, што праект «На хвалі часу, у плыні жыцця» аб'ядное яшчэ больш установ і зацікаўленых беларускай літаратурай людзей, а імёны «маладнякоўцаў» застануцца ў памяці нашчадкаў.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

